# Пяць малавядомых фактаў пра Алега Трусава

Якога Лукашэнка марыць бачыць **кандыдатам у прэзідэнты**.

У інтэрв'ю журналістам недзяржаўных СМІ Лукашэнка колькі слоў прысвяціў Алегу Трусаву. Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што хацеў бы бачыць старшыню Таварыства беларускай мовы кандыдатам у прэзідэнты. Прапануем некалькі малавядомых фактаў з мінулага Алега Трусава.

### Мае асабісты фонд у Нацыянальным архіве

Фонд мае нумар 576 і ўтрымлівае матэрыял як асабістага (нават студэнцкі білет), так і грамадска-палітычнага характару. Там знаходзяцца каштоўныя дакументы, прысвечаныя гісторыі БСДГ, БНФ і апазіцыі ў Вярхоўным Савеце XII склікання, а таксама першым прэздэнцкім выбарам у Беларусі ў 1994 г.

Акрамя Трусава, толькі Станіслаў Шушкевіч можа ганарыцца асабістым фондам (№599) у Нацыянальным архіве.

### Перамог міліцэйскага чына і партсакратара

22 студзеня 1990 г. Трусаў быў вылучаны кандыдатам у народныя дэпутаты радай ТБМ сталічнага Савецкага раёна. Але 25 студзеня 1990 г. Прэзідыум ВС БССР выдаў пастанову, паводле якой акруговыя камісіі мелі права дапускаць да ўдзелу ў выбарах кандыдатаў у дэпутаты ад Таварыства спажыўцоў, Беларускага экалагічнага саюза і Таварыства беларускай мовы толькі ў тым раёне, дзе гэтыя аб'яднанні былі зарэгістраваныя.

Пастанова парушала закон аб выбарах, але выбарчая камісія Мірашнічэнкаўскай акругі №33 у рэгістрацыі Трусаву адмовіла, бо ў Савецкім раёне аддзяленне ТБМ не мела рэгістрацыі. Трусаў аспрэчыў рашэнне ў Цэнтральнай камісіі па выбарах народных дэпутатаў і дабіўся праўды.

По Мірашнічэнкаўскай акрузе №33 на дэпутацкі мандат прэтэндавалі 6 чалавек. Сярод іх трое былі моцнымі супернікамі Трусава: намеснік міністра ўнутраных спраў, прарэктар Радыётэхнічнага інстытута (цяперашні БДУІР) і сакратар райкама партыі Савецкага раёна.

У першым туры ўдзел узялі 16330 з 21695 выбарцаў. Алег Трусаў набраў найбольшую — 3725 — колькасць галасоў і ў другі тур выйшаў разам з намеснікам міністра Віктарам Кавалёвым (2721 голас). У другім туры на выбары прыйшлі 13717 жыхароў акругі, з якіх за Трусава прагаласавалі 6876.



### Быў актыўным дэпутатам

У Вярхоўным Савеце Трусаў вылучыў сваю кандыдатуру на пасаду старшыні камісіі па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных зносінах. Сярод іншага, у сваёй уступнай прамове Трусаў прапанаваў разгледзець пытанне аб адкрыцці на Беларусі цыганскіх школаў. Але належнай колькасці галасоў яго кандыдатура не атрымала.

Тым не менш Алег Трусаў узначальваў парламенцкія камісіі. Быў намеснікам старшыні (Ніл Гілевіч) пастаяннай камісіі ВС па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны, узначальваў камісію па выпрацоўцы эталона Дзяржаўнага Герба, камісію па забеспячэнні адзінай палітыкі выкарыстання дзяржаўных сімвалаў. Дарэчы, намеснікам Трусава там быў Віктар Шэйман. Камісія, сярод іншага, не падтрымала ініцыятыву МУС аб выкарыстанні пяціканцовай зоркі для знакаў адрознення афіцэрскага складу, прыняла прынцыповае рашэнне не ламаць герб БССР на Доме ўрада. Было вырашана накрыць яго большай «Пагоняй», што і здарылася 27 ліпеня 1994 г.

### Пікіраваўся з Лукашэнкам

Так, у красавіку 1992 г. Трусаў выказаў абурэнне наконт таго, што Лукашэнка часта выкрастоўвае тэрмін «мая гаспадарка» ў адносінах да шклоўскага саўгаса «Гарадзец», дзе раней старшыняваў. У адказ Лукашэнка параіў Трусаву самому з'ехаць у саўгас і «положить там молодость и здоровье».

### Перадугадаў палітычны курс

Трусаў быў адным з трох дэпутатаў, які разам з Пазняком і Нятылькіным выступілі на інаўгурацыі Лукашэнкі. У сваім выступе Трусаў фактычна прадказаў сітуацыю, балючыя наступствы якой адбіліся праз два дзясяткі гадоў: «Непрымальнай з'яўляецца залежнасць Беларусі ад аднаго пастаўшчыка нафты і газу. Практычна ва ўсіх краінах свету ёсць некалькі крыніц энерганосьбітаў. Ліквідацыя манаполіі пастаўшчыкоў, пра якую толькі казаў, але нічога не рабіў урад Кебіча, застаецца найважнейшай задачай».

**Аляксандр Кур'яновіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР